Цэнтральнае месца ў творчасці Івана Мележа займае трылогія «Палеская хроніка» («Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Завеі, снежань»), дзеянне якой адбываецца ў родных для пісьменніка месцах. У ёй апісана жыццё палескай вёскі 20-30-х гадоў - цяжкасці пераходу да сацыялізму, калектывізацыя, раскулачванне. З вялікім талентам паказаны як гістарычны фон, так і адносіны герояў трылогіі. Паводле першапачатковай задумы ў «Палескую хроніку» павінны былі ўвайсці яшчэ два раманы («За асакою бераг» і «Праўда вясны»), аднак смерць пісьменніка ў 1976 годзе не дала ажыццявіцца гэтым планам.










По творах пісьменніка пастаўлены спектаклі, зняты мастацкія фільмы. Мележ – аўтар літаратурна-крытычных артыкулаў, нарысаў, публіцыстычных выступаў.







Імя Івана Мележа носяць вуліцы ў Мінску і іншых гарадах Беларусі. У Мінску, на доме № 7 па вуліцы Янкі Купалы, дзе жыў народны пісьменнік, усталявана мемарыяльная дошка.

У аграгарадку Глінішчы створаны літаратурны музей і ўстаноўлены бюст Івана Мележа.

У 2010 годзе ў Хойніках адкрыта скульптурная кампазіцыя «Людзі на балоце».

Жыццю і творчасці пісьменніка прысвечаны дакументальны фільм «Іван Мележ».

**Бібліятэка ім. Д.Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі**



# ІВАН ПАЎЛАВІЧ МЕЛЕЖ

**(105 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі)**

**Горкі, 2026**





Іван Паўлавіч Мележ — народны пісьменнік Беларусі, драматург, публіцыст. Аўтар трылогіі «Палеская хроніка», якая лічыцца нацыянальнай эпапеяй.

Нарадзіўся 8 лютага 1921 года ў сялянскай сям'і ў вёсцы Глінішча Рэчыцкага павета Гомельскай губерні (цяпер Хойніцкі раён Гомельскай вобласці). Атрымаўшы школьны атэстат з адзнакай, паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры, але вайна перапыніла вучобу. Прайшоў праз франты пад Мікалаевам і Растовам-на-Доне і перажыў два раненні.



Пасля заканчэння БДУ (1945) і аспірантуры ён сумяшчаў выкладанне ва ўніверсітэце з працай у часопісе «Полымя». Яго талент і аўтарытэт прывялі яго ў кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў БССР, дзе працаваў сакратаром і намеснікам старшыні праўлення. Таксама актыўна ўдзельнічаў у дзяржаўным жыцці як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

Друкаваўся з 1930 года. У 1939 г. быў апублікаваны першы верш «Радзіме». Перад вайной яго вершы друкаваліся ў газетах «Літаратура і мастацтва», «Бальшавік Палесся», у 1943 г. ў «Бугурусланской правде». З 1942 г. выкладаў ваенную падрыхтоўку і завочна вучыўся на літаратурным факультэце Малдаўскага педагагічнага інстытута (месціўся ў Бугуруслане).



Першыя апавяданні напісаў у Тбіліскім шпіталі. У 1944 г. у газеце «Звязда» выйшаў апавед «Сустрэча ў шпіталі». У 1946 годзе выдаў першы зборнік апавяданняў «У завіруху». У 1948 г. выйшаў другі зборнік прозы «Гарачы жнівень». Аўтар рамана «Мінскі напрамак» (пра Вялікую Айчынную вайну і пасляваенны перыяд), зборнікаў прозы «Блізкае і далёкае», «У гарах дажджы», «Што ён за чалавек». Спрабаваў сябе ў драматургіі, часцей за іншых ставілася п'еса «Пакуль вы маладыя».




***"Мова – гэта вялікі народны скарб. Яго нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ"***